# АСАБЛІВАСЦІ НАРОДНАГА ТКАЦТВА ВЕТКАЎШЧЫНЫ

**В. Каўтуноў**

Народнае ткацтва Беларусі паходзіць з глыбокай старажытнасці. У перыяд XIX – XX стст. назіраецца росквіт гэтага віда народнага мастацтва. Значную цікавасць для навуковага вывучэння уяўляе спецыфіка народнага ткацтва розных гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі, у т.л. Падняпроўя. Самабытнасць і арыгінальнасць неглюбскіх ручнікоў, якія паходзяць з Веткаўшчыны, абумовіла мэту дадзенага даследавання - аналіз асабліваасцей народнага ткацтва вызначанага рэгіёна ў XIX – XX стст. Дзеля дасягнення пастаўленай мэты выкарыстоўваўся экспедыцыйны метад даследавання ў спалучэнні з гісторыка-параўнальным і тыпалагічным метадамі вывучэння сабраных матэрыялаў.

[2] Жыцця адвечны лад. - Кн. 2. – Мн., 1998; Сержпутоўскі А.К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў. – Мн., 1998; Никифоровский Н.Я. Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности.- Витебск, 1895; ён жа. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах.- Витебск, 1897 і інш.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Крыніцамі для вызначэння спецыфікі неглюбскага ткацтва з'явіліся ручнікі, якія знаходзяцца на захоўванні ў Неглюбскім краязнаўчым музеі, а таксама матэрыялы, самастойна вывучаныя аўтарам у прыватных калекцыях ткачых в. Неглюбка Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці. Для навуковага аналізу намі былі атабраны 26 вырабаў з больш за 60 вывучаных адзінак, якія найбольш яскрава ўвасобілі характэрныя рысы ткацтва Веткаўшчыны. Найбольшую каштоўнасць маюць рэчы, выяўленыя намі ў сем'ях ткачых А.А.Лапіцкай, П.Т.Суглоб, У.Р.Суглоб, Е.Р.Петрашэнка, Лямцавых. У час экспедыцыі праводзілася вуснае апытанне названых інфарматараў па спецыяльнай праграме, складзенай аўтарам. Для супастаўнага вывучэння прыцягваліся каталогі ткацкіх вырабаў некаторых музеяў Беларусі і пісьмовыя крыніцы – працы беларускіх этнографаў XIX – пачатку XX ст.

У тэхніцы неглюбскага ткацтва пераважае пераборнае аднабаковае. Даўжыня ручнікоў набліжаецца да 5 м, шырыня – 0,5 м. Арнаментаваныя канцы ручніка дасягаюць 1,5 м. Сярэдзіна ручнікоў аздабляецца чырвонымі гарызантальнымі паласамі. У апошні час у сувязі з выкарыстаннем шматлікай колькасці нітак часта ствараюцца рознакаляровыя ручнікі (з чорным, сінім, жоўтым, зялёным колерамі). Пераважае геаметрычны арнамент. Вытканыя сімвалы паходзяць з глыбокай старажытнасці, у іх прасочваецца язычніцкі ўплыў. Найбольш папулярныя такія матывы арнамента, як "казельчыкі", "самавары", "павукі", "вядзьмедзі".

Асноўную спецыфіку неглюбскага ручніка стварае насычанасць арнаментаванага фону, яркае аздабленне, непаўторны каларыт. Разам з тым маюць месца агульнаславянскія вытокі мясцовых традыцый ткацтва, што ў значнай ступені тлумачыцца памежжоўным становішчам вывучаемага рэгіёна на сутыку Беларусі, Украіны, Расіі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ